# «ЧАЛАВЕЦТВА Ў СВАІМ РАЗВІЦЦІ ПАЙШЛО НЕ ПА ТОЙ ДАРОЗЕ...»

Аповесці І. Шамякіна 1990-х гадоў сведчаць пра дастаткова канцэпцыйны погляд пісьменніка на праблемы рэчаіснасці, асаблівасці іх мастацкага асэнсавання і адлюстравання.

«І. Шамякін прапанаваў уласную мастацкую канцэпцыю чалавека і рэчаіснасці, суб'ектыўную, а ў многім аб'ектыўную, версію падзей, існавання асобы ў грамадстве,— адзначае Алесь Бельскі.— «Чалавецтва ў сваім развіцці пайшло не па той дарозе»,— такой думкі прытрымліваецца пісьменнік і даводзіць, што сучаснае грамадства аддаляецца ад ідэі каштоўнасці чалавечага жыцця, роўнасці людзей і чалавечага братэрства»[1].

Якія ж прыкметы гэтай канцэпцыйнасці?

Па-першае, пісьменнік даволі сістэмна выявіў у рэчаіснасці тыя праявы, якія вядуць грамадства да маральнага падзення. Яны выразна зафіксаваны ў дзённікавых запісах пісьменніка[2]; гэта не толькі адпаведная форма фіксацыі грамадзянскіх роздумаў І. Шамякіна, але і сведчанне (мэтанакіраванае ці спантаннае — тут ужо іншая гаворка) асаблівасцей адбору ім матэрыялу для яго мастацкага адлюстравання. Пісьменніка цікавіў не толькі звычайны просты чалавек, яго патрэбы і памкненні, пошукі, сродкі выжывання ў разбуральнай рэчаіснасці («Сатанінскі тур», «Без пакаяння», «Палеская мадонна» і інш.), але і чалавек з культурнай або навуковай, партыйнай эліты («Сатанінскі тур», «Адна на падмостках», «Вернісаж», «Бумеранг» і

[1] Бельскі, А. Чалавек — час — мараль у прозе І. Шамякіна пра сучаснасць // Беларуская мова і літаратура.— 2005.— № 1.— С. 4.

[2] Шамякін, І. Роздум на апошнім перагоне: Дзённікі 1980—1995 гадоў.— Мінск, 1998.— 527 с. (Далей цытаты па гэтым выданні падаюцца з пазначэннем старонкі ў дужках.)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

інш.). І. Шамякін адлюстраваў таксама праблемы жыцця і «подзвігі» «герояў» новага часу — бізнесменаў, валадароў мясцовага значэння розных рангаў («Сатанінскі тур», «Падзенне», «Без пакаяння» і інш.). Як бачым, у прыведзеным вышэй пераліку твораў адна і тая ж аповесць апынаецца ў розных тэматычна-праблемных пазіцыях. Гэта нездарма.

Кожная новая аповесць пісьменніка, нягледзячы на, здавалася б, паўтаральнасць тэмы і праблематыкі, падабенства літаратурных тыпаў, шляхоў узнікнення і вырашэння канфліктаў, з'яўляецца своеасаблівай новай падсветкай таму, што ў папярэднім паводле часу стварэння тэксце акрэслівалася альбо фрагментарна (напрыклад, праблема галоднага дзяцінства ў новым часе: «Роздум на апошнім перагоне...» // «Без пакаяння»), альбо толькі абсалютызавана (напрыклад, праблема маральнай усёдазволенасці для прадпрымальнікаў новага часу: «Сатанінскі тур» // «Без пакаяння», праблема помсты ў лёсах розных пакаленняў адной сям'і: «Падзенне» // «Бумеранг»). Пры, на першы погляд, сутнасным падабенстве канфліктаў у адпаведных аповесцях шляхі развіцця і трагічнага вырашэння іх не падобныя, яны вызначаюцца пэўнай доляй разнастайнасці з пункту гледжання верагоднасці. У сувязі з гэтым прывядзём наступнае сведчанне пісьменніка аб вырашэнні канфлікту ў аповесці «Без пакаяння»: «У фінале элемент выпадковасці, хоць логіка падзей непазбежна прыводзіць да смерці Анкуды: турма — банальна. Але іншай смерці я не прыдумаў. Павесіўся? Не страляе. Гэта было. Але там, у «Вернісажы», канчае жыццё праз павешанне выдатны мастак, расчараваны «дэмакратыяй». Вешаецца забойца — не тое. Сумленне, пакуты яго ганяюць Анкуду на машыне. І ён павінен быў загінуць у машыне. Хто іграе са смерцю, таго яна падсцерагае на кожным крутым павароце» (506).

Па-другое, вылучыўшы разбуральныя праявы ў грамадскім жыцці, пісьменнік у розных мастацкіх кантэкстах паказаў асаблівасці іх узнікнення (часцей гэта прапаноўваецца ў рэтраспекцыйных частках), развіцця і выніковасці ў адпаведных падзейных сітуацыях. У гэтым сэнсе аповесці І. Шамякіна 1990-х гадоў у сукупнасці іх сацыяльных «зрэзаў» — своеасаблівая літаратурная панарама супярэчлівых, разбуральных, перспектыўных і бесперспектыўных маральных праяў рэчаіснасці гэтага часу: «За тры тыдні выдыхнуў «Без пакаяння» — сто старонак. [...] Па-мойму, атрымалася. Невялікі зрэз сучаснага жыцця: падзенне новых гаспадароў і старых чыноўнікаў — тэма, якая праходзіць у «Падзенні». Утрымаўся ад спакусы пабудаваць дэтэктыўны сюжэт...» (506).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прасочым вылучаныя вышэй асаблівасці на прыкладзе аповесцей «Без пакаяння», «Бумеранг» (абедзве 1994), «Партрэт», «Выкармак» (абедзве 1995), «Крывінка» (1996).

Аповесць «Без пакаяння» прадстаўляе два нераўназначныя (паводле падзейнасці ў творы) сацыяльныя «зрэзы» з рэчаіснасці першай паловы 1990-х гадоў: абсалютныя беднасць і багацце, імкненне да пакаяння і непрыманне яго. Тут можна правесці паралель з аповесцямі «Сатанінскі тур», «Падзенне», «Адна на падмостках», «Палеская мадонна» — творамі, у якіх такое супастаўленне не выходзіць на першы план.

У пачатку аповесці «Без пакаяння» фрагментарна акрэсліваюцца ўмовы выжывання сям'і чатырнаццацігадовага Васілька Кірпача: «Трэці месяц хварэе маці, не ходзіць на працу. А тут яшчэ і сястрычка Анька ангіну схапіла. А бацька зноў запіў. Украў пазаўчора і тыя грошы, што прынеслі маці з фабрыкі — дапамогу, і тыя, што зарабіў ён [Васілёк] мыццём машын, калі ішлі дажджы. За што купіць хлеб і малако?»

Гэтыя факты потым пацвярджаюцца ў эпізодзе наведвання следчым Кудрам сям'і забітага хлопчыка («бедны пакой» з «цвёрдай канапай»), а таксама расповедам у хлебнай краме Анкуды «старой» («Бабачкі, у хаце ж хоць шаром пакаці. Прапіў усё п'янюга (Васількоў бацька.— *А. М.*). І памінкі няма за што справіць»), якая прыйшла збіраць сюды міласціну на пахаванне Васілька, сведчаннем Ларысы — Анкудавай жонкі, якая «была на пахаванні хлопчыка».

І калі ў дзённіках «Роздум на апошнім перагоне...» пісьменнік толькі фрагментарна акрэсліў праблему цяперашняга і будучага жыцця дзяцей (адна частка дзяцей — будучыні краіны — гэта тая, якой можа пагражаць голад (390), а другая частка («дзеці, унукі сённяшніх спекулянтаў, якія скончаць Сарбону, Кембрыдж, Гарвард») пры гэтым не падумае пра «галодных» (433), то ў гэтай аповесці ён развіў папярэднія свае заўвагі ў дастаткова выразным і доказным сюжэтным кантэксце. Як бы гэта ні гучала жорстка, І. Шамякін пазбавіў (хай сабе і праз выпадковасць) жыцця свайго маленькага героя — Васілька, які, паводле адпаведных характарыстык (апасродкаваных — аўтарскіх, непасрэдных і апасродкаваных — матчыных, бацькавых, «старой»), з'яўляецца дастаткова прыстойным прадстаўніком таго пакалення, якому ствараць будучыню. Перспектыва лепшай будучыні такім чынам перакрэсліваецца.

Суаднясём характарыстыкі гэтага героя аповесці з яго прозвішчам.

Васілёк, паводле выказванняў маці, памяркоўны, разумны, паводле ацэнак бацькі, ён спагадлівы, з аповеду «старой» у Анкудавай краме вынікае, што ён быў вартым пашаны хлопчыкам. У

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

той жа час у розных частках аповесці гэты вобраз апасродкавана супастаўляецца з найгоршымі прадстаўнікамі падлеткавага асяроддзя. Прыгадаем, напрыклад, самы пачатак аповесці, дзе прыводзяцца непасрэдныя характарыстыкі ўзаемаадносін у асяроддзі падлеткаў, якія зарабляюць мыйкай машын (Бамбіза-Рагач, «спаганяў з малых мыйшчыкаў немалы падатак, палавіну заробку адбіраў. Яны кіпелі злосцю на яго, называлі Шпрыцам, змаўляліся ўзняць бунт. Але ў Шпрыца свая брыгада, яна ахоўвала пляцоўку ад чужакоў, інакш тут былі б хлопцы з усяго раёна, з пяці школ. Шпрыц даваў зарабляць узаконенай брыгадзе. І яго трывалі. Ад яго можна было скрыць атрыманыя «зайцы» і долары; ён не дайшоў да таго, каб выварочваць мыйшчыкам кішэні, а кажуць, на вакзале ці каля «Планеты» такія вось «шпрыцы» робяць і гэта: высмакчуць ды яшчэ «ўкол» зробяць»), сведчанні Васількавага бацькі аб канкурэнцыі сярод гэтых мыйшчыкаў, як «улетку пабілі». Васілька, выснову ў краме адносна дзіцячых «разборак».

Прозвішча Васілька — Кірпач — гаворачае. Можна вылучыць два сэнсавыя аспекты ў ім на падставе размоўнай лексікі, якая сярод яе носьбітаў даволі часта вар'іруецца, перастварaецца дзеля новага сэнсу. Кожны з вылучаных ніжэй сэнсаў дапаўняецца адзін другім. Кірпач — ад 'кірпаты. 1. Кароткі і задзёрты'[1]. Гэтае прозвішча можа суадносіцца і з дзеясловам 'корпацца. 1. Капацца ў чым-н. рыхлым, сыпкім'[2]. І ў адным, і ў другім выпадку з прыведзенай паралелі вынікае, што падлетак, які мог бы стаць вартым павагі ў будучым жыцці, мог бы рабіць яго лепшым, для цяперашняй рэчаіснасці *кароткі*, ён незапатрабаваны ёй (прыгадаем: Васілёк у сухое надвор'е ніяк не можа знайсці тую машыну, памыўшы якую, змог бы нешта зарабіць, а знаходзіў такія машыны толькі ў слотнае надвор'е). І вось такая незапатрабаванасць прымушае яго *корпацца* ў сметніку гэтай рэчаіснасці (прыгадаем: і сярод дзіцячага бізнесу пануе рэкет, няраўнапраўе, несправядлівасць, няўдача і г. д.), а вартае яго існасці *сыпкае*: яно як той пясок выслізгвае з хлопчыкавых рук.

Паказальны для прыведзенага вышэй кантэксту той факт, што Васілёк, які жыве ў асяроддзі, дзе крадуць і дарослыя і дзеці, скраўшы батон хлеба для галоднай маці і хворай сястры, пры гэтым адчувае згрызоты сумлення, жадае пакласці назад гэты злашчасны батон. І толькі клопат пра родных людзей, уласны голад прымушаюць яго не рабіць такі крок.

[1] Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т.— Мінск, 1978.— Т. 2.— С. 689.

[2] Тамсама.— С. 715.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Як і ў аповесці «Адна на падмостках», у гэтым творы важную ролю адыгрывае выпадковасць. Толькі калі ў «Адной на падмостках» скачок ката Лізуна ў акно — гэта выпадковасць, якая не толькі выратоўвае гераіню твора, але і спрыяе сэнсаўтваральнай сутворчасці з боку чытача, то ў «Без пакаяння» выпадковасць (пнеўматычная куля трапляе ў Васількова вуха) — гэта і своеасаблівы сюжэтаарганізуючы ход, і сэнсаўтваральны факт. Такая трагічная выпадковасць дазваляе засяродзіцца на асэнсаванні ў кантэксце аповесці аднаго з народных выслоўяў: «Бог забірае да сябе найлепшых». Не будзем абсалютызаваць выключнасць Васілька. Але ж у тым дзіцячым асяроддзі, у якім ён існаваў, хлопчык сапраўды быў лепшым за іншых. Складваецца такое ўражанне, што пісьменнік знарок падкрэслівае разбуральную здольнасць новай рэчаіснасці: яна выпіхвае са сваёй прасторы лепшых з яе прадстаўнікоў. Можна ў сувязі з гэтым прыгадаць той факт, як у аповесці «Сатанінскі тур» гандляркі абураліся спазненнем Ядзі (таксама падлетак) на прызначаны збор у аўтобусе менавіта з-за таго, што яна наведвала ў Варшаве мастацкі музей. От калі б гандлявала ды спазнілася — было б усё ў парадку (як з той аптэкаркай Сіўцовай), а тут — музей. Яна што, лепшая за іх? Разумнейшая за іх? Такія пытанні выкідвае нікчэмнасць у прастору, калі тая прастора ставіць побач гандляра з яго прыземленымі клопатамі і чалавека з яго ўзвышанымі патрэбамі.

Узвышанай (хоць выкліканай голадам) была і патрэба Васілька. Ён краў не батон у Анкуды, ён спрабаваў пазычыць (прыгадаем апраўданне хлопчыка: адпрацую, машыну памыю), узяць на павер. Але гэтая яго просьба «я пазычаю» не была пачутая Анкудам, гаспадаром хлебнай крамы, які, каб напужаць «злодзея», выпадкова яго застрэліў з пнеўматычнага пісталета.

Вось гэтыя, вылучаныя вышэй, абставіны, у якіх жыве Васілёк і пры якіх адбываецца яго забойства, выразна высвятляюць у вобразе Анкуды не толькі выпадковага, але і патэнцыйнага забойцу, не толькі злачынцу, які імкнецца пазбегнуць пакарання, але і чалавека, які пакутуе ад зробленага ім. І ў гэтым — найбольшая вартасць гэтага твора. Зразумела, што Шамякін-пісьменнік не спачуваў свайму герою, пра што ўскосна таксама сведчаць яго дзённікавыя запісы (485, 505, 506). У той жа час усёведаючы аўтар аповесці ўзвёў свайго героя не толькі на шлях уцёкаў ад пакарання, але і на шлях пакутаў (хай сабе і нязначных у параўнанні з пакутамі маці забітага ім хлопчыка), на шлях хоць і частковага, але пакаяння.

Анкуда — трыццацідвухгадовы прадпрымальнік. У былым ён камсамольскі работнік, які выракся ранейшых ідэалаў: «...на мітынгах адважна кляйміў сваіх учарашніх калег па партыі і кам



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

самоле!..» У гэтым пісьменнік паўтараецца, вар'іруе ў розных мастацкіх кантэкстах адзін і той жа факт прататыпнай рэчаіснасці; тут можна параўнаць фрагментарныя факты з мінулага гэтага героя аповесці і дастаткова разгорнутыя факты з біяграфіі, напрыклад, Узёнтака, начальніка змены мытнікаў Кастуся з аповесці «Сатанінскі тур». У адрозненне ад названых герояў «Сатанінскага тура», Анкуда ў першую чаргу ўласнай напружанай працай прадпрымальніка ў межах магчымага (ва ўмовах хабарніцтва, махінацый і г. д.) стараецца наладзіць сваю справу: «Трэба рабіць самім! Усё, што толькі можна, самім!» Тут да месца будзе прыгадаць сведчанні з дзённікавых запісаў І. Шамякіна за студзень 1994 года адносна яго стаўлення да «буржуазіі» новага часу: «Тры месяцы не пішу. Свярбяць рукі. Складваецца сюжэт: забойства галоднага хлопчыка камерсантам. Забойства — завязка. [...] Да буржуазіі, якая вылупліваецца з яек сацыялізму..., адносіны ў мяне да заблытанасці складаныя. Сацыяліст і гуманіст, я буду іх выкрываць. Але ў эканамічным плане я гатовы прызнаць іх, каб яны пачалі ствараць, а не нажываць капітал спекуляцыяй, тым, што было зроблена іх бацькамі пры сацыялізме. Каб яны рабіліся цывілізаванымі і дбалі пра народ. Усе ж — адукаваныя людзі, сынкі былых камуністаў» (485).

У дзённікавых жа запісах (толькі раней, за май 1992 года) пісьменнік прывёў і іншую выснову аб «трэцім саслоўі»: злачыннасці яго нараджэння: «Ці ёсць хоць адзін твор і ў прозе і ў паэзіі аб сучасным жыцці людзей — рабочых, сялян, інтэлігенцыі, аб нараджэнні «трэцяга саслоўя» — як злачынна яно нараджаецца? Большасць мільянераў можна сёння садзіць на лаўку падсудных» (395).

Варта зазначыць у сувязі з гэтым, што І. Шамякіна як асобу, якая незадаволена нарастаючым тэмпам пашырэння негатыўных уплываў прадпрымальнікаў на тагачаснае жыццё, перамагае ўсёведаючы аўтар, які бачыць у асобе Анкуды, акрамя іншага, яшчэ і чалавечы твар, яго імкненне да здабывання матэрыяльных выгод праз уласную напружаную працу. Іншая рэч, што ўмовы, у якіх апынаецца гэты літаратурны герой, прымушаюць яго падпарадкоўвацца законам хабарніцкага выжывання.

Анкуда паўстае не толькі забойцам, які замятае сляды свайго злачынства, але і чалавекам, у свядомасці якога час ад часу пачынае пульсаваць сумленне. Прыгадаем у сувязі з гэтым, напрыклад, наступныя факты.

Заўважыўшы нерухомае цела падлетка, Анкуда ўцякае з гэтага месца; у той жа час ён адчувае, што абавязаны дапамагчы, хаця б выклікаўшы «хуткую»: «...не пакідала выхаваная сялянскай марал-лю, школай: абавязаны дапамагчы. Як? Пазваніць у "хуткую"?».



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«Худзенькая постаць» хлопчыка аднойчы з'явіўшыся ў свядомасці Казіміра, не дае яму спакою і надалей: «Як п'яны, сеў у машыну (пасля таго, калі даведаўся ў краме, што хлопчык памёр.— *А. М.*). [...] Сустрэчныя машыны і тыя, што ішлі наперадзе, расплываліся ў бясформенныя плямы. З іх, з плям, часам праяўлялася невыразная дзіцячая постаць. І тады вочы залівау пот жудасці...» Адразу пасля здарэння Анкуда разумее, што трэба было інакш дапамагчы хлопчыку: «...хаця б аднесці на тратуар. Адзець пальчаткі». Анкудава сумленне да таго часу, пакуль ён не даведаўся, што ўчыніў забойства, не адмахваецца ад гэтага непрыемнага выпадку. Гаспадар хлебнай крамы спрабуе асэнсаваць свой учынак з пазіцыі мэтазгоднасці. Нібы прадчуваючы нядобрае, ён прыходзіць да наступнай высновы: «Я не дарую сабе, калі...» Пакуль яшчэ дрэмлючае імкненне да самазахавання ў гэтай сітуацыі выступае ў абарону свайго гаспадара толькі на ўзроўні аспрэчвання магчымай бяды: ён не мог учыніць забойства, бо не хацеў гэтага: «Такая драбінка не можа забіць. Куды я цэліў? Не цэліў я ў яго. Хацеў напалохаць». Калі ж Анкуда даведваецца, што яго стрэл у хлопчыка стаў для апошняга смяротным, яго ахоплівае страх, роспач і нават адчуванне жадання пакараць сябе праз аварыю. Але тут жа прыходзіць цвярозасць: навошта. «Яшчэ адна ахвяра па яго віне?»

У такой сітуацыі Анкуда імкнецца апраўдацца перад сабой не толькі праз канстатацыю таго, што ён не думаў пра забойства, калі выпадкова яго здзяйсняў. Пры гэтым ён нясмела спрабуе пераканаць сябе ў тым, што і хлопчык быў вінаваты ў трагедыі, бо ўкраў: «У мяне ж не было ніякага злога намеру, проста хацеў спалохаць. Хіба мне батона шкада было? Я сотню іх аддаў... грошы і хлеб. Але трэба вучыць: чужога не чапай... Не навучым — не выжывем мы, новы клас».

Пасля часовай разгубленасці ў Анкуды з'яўляецца рашучасць у нахабнай самаабароне перад следчым; на нейкі час пасля самаабароны ў выглядзе хабару пракурору Якімкіну яго «сумленне змоўкла». І хоць у час святкавання ў сям'і «правернутага дзела» з хабарам Якімкіну ў Анкудавым фужэры з шампанскім «усплыла труна з нябожчыкам... худзенькім хлопчыкам», ён усё ж быў перакананы, што ўжо нішто «не парушыць яго жыцця». І ўжо не на падпітку, як напярэдадні, а ў цвярозым стане Анкуда прыходзіць да наступнага пераканання: «...вылаяў сябе: "Ідыёт! Не напамінай сабе пра іх. Справа закрыта. Назаўсёды! Ларыса выграбла ўсю касу. І на пахаванне, глядзі, не з пустымі рукамі хадзіла. Хопіць. Старая ў булачнай сказала, што бацька ўсё прапівае. Так што бацькавай віны больш. Давёў хлопца"».

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам Анкуда перакрэслівае сваё жаданне яшчэ раз (у час збору міласціны ў яго краме ён загадаў жонцы перадаць на Васількова пахаванне ўсю дзённую выручку) дапамагчы сям'і забітага ім хлопчыка.

Аднак такі спакой для яго толькі часовы. Следчы Кудра прадаўжае шукаць доказы. У душы галоўнага героя аповесці зноў «наступае страх, разгубленасць, бездапаможнасць і жаль да сябе, пакрыўджанага лёсам». І зноў (цяпер у сне) з'яўляецца прывід забітага ім хлопчыка, каб ужо ніколі не адступіць ад яго.

Своеасаблівая форма першага нясмелага пакаяння Анкуды — яго прызнанне жонцы ў выпадкова зробленым ім забойстве. Праўда, такое прызнанне ён не атаясамлівае з пакаяннем; плануючы яго, ён успрымаў гэтае прызнанне як «незвычайную помсту» жонцы, ён хацеў яе «зрабіць саўдзельніцай свайго злачынства». Анкуда знаходзіць сабе апраўданне ў імкненні выжыць у такой сітуацыі: дзеля Жанеты, дачкі: «А для гэтага трэба застацца на волі».

У той жа час пісьменнік надзяліў свайго героя неагучаным (ні для самога Анкуды ім самім, ні для чытача пісьменнікам) адчуваннем, што кожны новы дзень набліжае яго да пакарання. Нездарма ж, калі страх, разгубленасць, сумленне прыводзяць Анкуду «ў маленства», у бацькаву хату, з'явілася «думка, што ён як бы развітваецца, з самым дарагім развітваецца — таму, што ніколі ўжо не вернецца сюды». Цяжка вызначыць адназначна, што падштурхнула Казіміра да прызнання маці ў забойстве: усё тыя ж страх, разгубленасць, жаданне знайсці спачуванне і разуменне, ці абуджанае сумленне? Але ў любым выпадку гэтае прызнанне адбываецца. Адбываецца шчыра (не з такой мэтай, як перад жонкай); гэта своеасаблівы першы крок да пакаяння, на якое (больш шырокае, можа, і абсалютнае) Казіміра потым катэгарычна зарыентавала маці: ён павінен прызнацца і прыняць пакаранне: «Пакайся, сынок. Перад Богам. І перад людзьмі».

Другі крок да пакаяння Анкуды — гэта яго няўдалая спроба споведзі ў царкве. Ён «перад людзьмі не хацеў каяцца. А перад Богам вырашыў пакаяцца. Пераканаў сябе, што ад гэтага стане лягчэй». Аднак святар не адпускае яму страшны грэх забойства. Пакаянне перад Богам не адбылося, бо і бацюшкаву параду прыняць пакаранне за зробленае забойства Анкуда адпрэчвае.

Пісьменнік прыводзіць свайго героя ў сітуацыю загнанага ваўка. Толькі загон, у якім ён гіне, стварае сабе сам Анкуда. Ён зыходзіць з жыцця, уцякаючы ад сваіх праследнікаў (хаўруснікаў яго ранейшага абаронцы ад закона — пракурора-хабарніка Якімкіна) такім чынам, каб стварыць небяспечную дарожную сітуацыю, у якой бы яны загінулі. Страх пакарання з боку закона і з боку «сваіх» не



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дазваляе Анкуду канчаткова ажывіць у свядомасці сумленне, якое, магчыма, магло б выратаваць яго душу. Анкуда становіцца ахвярай уласнага жадання ўчыніць нібыта выпадковае (у адрозненне ад стрэлу каля крамы), а на самай справе спланаванае забойства-аварыю сваіх праследнікаў.

Галоўнаму герою «Падзення», які стаў віноўнікам смерці жонкі, І. Шамякін у фінале твора пакінуў магчымасць для пакаяння. Анкуду ж ён пазбавіў такой магчымасці; гэты літаратурны герой-забойца адыходзіць у нябыт без пакаяння. Матчын і святароў наказ аб ачышчэнні душы праз пакаянне і прынятае пасля яго пакаранне застаюцца ім незапатрабаванымі. Таму, відаць, невыпадкова на сустрэчнай паласе (пасля таго, як «Ніву» праследнікаў «крутнула раз, другі, развярнула ў супрацьлеглы бок») з'яўляецца той «КамАЗ», з якім сутыкаецца легкавушка Анкуды, які так віртуозна спрабаваў стварыць аварыйную сітуацыю для сваіх ворагаў. «Камень на душы» (вызначэнне Казіміравай маці) імкліва «цягне» Анкуду да апошняга ўчынку ў яго жыцці, да апошняга супынку ў ім: у «сцюдзёную ваду», што пад мостам, на якім адбылася аварыя.

Зло нібыта пакарана ў асобе Анкуды. Але ці знікла яно? Відаць, не. Яно, паводле І. Шамякіна, працягвае існаваць у прасторы, яно запаўняе яе сабой нават ва ўмовах, якія, здавалася б, не спрыяюць гэтаму. Пакаранне злом нараджае новае зло. Яно вяртаецца як бумеранг. Пра гэта таксама і аднайменная аповесць І. Шамякіна.

У дзённікавых запісах «Роздум на апошнім перагоне...» пісьменнік акрэсліў праблемную сітуацыю, якую ў аповесці «Бумеранг» неаднаразова будзе асэнсоўваць галоўны герой твора,— «крыўда штурхае на помсту» зняволеных у савецкім лагеры людзей (да 70-годдзя Сталіна яны рыхтуюць для яго падарунак: адмыслова зроблены прыбор з радыяцыяй), але ж помста тая аказалася безвыніковай для яе адрасата. Яна бумерангам вяртаецца да аднаго з яе здзяйсняльнікаў.

«Сучасны метад помсты» (478) і яго разбуральныя для невінаватых людзей вынікі І. Шамякін адлюстраваў у аповесці «Бумеранг» праз спалучэнне рэальнага мастацкага свету твора з рэтраспекцыйным, які прадстаўлены ў аповесці дастаткова шырока. Падзеі рэальнага мастацкага свету адбываюцца ў канцы 1993 года, падзеі з успамінаў галоўнага героя адносяцца да ваеннага перыяду, часу зняволення яго ў савецкім лагеры.

Галоўны герой твора — Іван Мацвеевіч Жыгуновіч — пенсіянер, у былым — кандыдат навук, прафесар матэматыкі. Жыццё яго сям'і да пэўных момантаў працякала ў даволі спакойнай плыні падзей,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

узаемаадносін, планаў і ўмоў іх ажыццяўлення. «Увогуле ў іх вясёлая сям'я; калі яшчэ прыязджала старэйшая дачка Алена з дачкой Жаннай, смех у доме не сціхаў».

Пасля пераходу зяця Паўліка ў беларуска-нямецкую фірму «ад заробкаў яго дабрабыт сям'і ненамнога вырас; па-ранейшаму аснова сямейнага бюджэту — яго (галоўнага героя.— *А. М.*) і жончына пенсія, яны нічога не купляюць з рэчаў, усё — на ежу...».

У пачатку аповесці (рэальны мастацкі свет) Іван Мацвеевіч клапоціцца аб стварэнні драўляных скульптур для парка (ён цяпер «разьбяр, скульптар, жывапісец»). Тут маем справу з дастаткова актыўным грамадскім жыццём няўрымслівага пенсіянера. Такая грамадская дзейснасць раптоўна перапыняецца паведамленнем (другая акалічнасць, якая абсалютна азмрочыла жыццё гэтай сям'і) аб небяспечнай хваробе дачкі Алены, якая жыве ў Маскве. Першая ж падзея, якая прынесла неспакой у гэтую сям'ю — ад'езд унука Вані разам са сваім бацькам і яго родзічамі Айзенбергамі ў Аўстралію, стала прычынай душэўнага болю Таццяны Хведараўны і Алены за Ваню.

Іван Мацвеевіч разам з жонкай Таццянай Хведараўнай вырашаюць неадкладна паехаць на дапамогу да хворай дачкі і разгубленай унучкі Жанны — студэнткі медыцынскага інстытута. Меркаванні доктара адносна прамянёвай хваробы Алены, суаднясенне Іванам Мацвеевічам некаторых фактаў (праца дачкі на працягу 10 гадоў у Музеі Рэвалюцыі ў сховішчы побач са зробленым некалі Жыгуновічам і яго сябрамі падарункам Сталіну) падводзяць галоўнага героя да разумення, што менавіта ён з'яўляецца ўскосным віноўнікам хваробы сваёй дачкі. Далейшыя падзеі рэальнага свету: клопаты пра Алену яе бацькоў, дзяцей — Жанны і 15-гадовага Вані (ён вярнуўся з Аўстраліі, пражыўшы там год разам з бацькам, зразумеўшы, што гэтая вялікая краіна яму малая, што «цесна там»; едучы ў Маскву, хлопец нават не ведае, што маці знаходзіцца ў цяжкім стане). У розных кантэкстах невялікага паводле падзейнасці рэальнага мастацкага свету твора ўсплываюць успаміны Івана Мацвеевіча, напісаныя ім раней пра ваенны час, час савецкага зняволення.

Такім чынам, большая частка аповесці — гэта рэтраспекцыі: а) факты з мінулага жыцця сям'і: замужжа Алены і ад'езд у Аўстралію «немалога клану» Айзенбергаў і разам з імі ўнука Івана Мацвеевіча, Вані; кароткія заўвагі-сведчанні аб жыцці малодшай дачкі Насці і яе мужа Паўліка; б) успаміны Івана Мацвеевіча пра ўласнае ваеннае і пасляваеннае жыццё, якія паступова падводзілі яго да ўдзелу ў стварэнні таго небяспечнага падарунка-помсты Сталіну, што стаў «ледзьве не праз паўстагоддзе» прычынай хваробы Алены.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У рэальным мастацкім свеце галоўны герой аповесці стварае рэтраспекцыйны мастацкі свет. Іван Мацвеевіч «...канспектыўна «прачытваў» тое, што запісаў яшчэ гадоў дваццаць таму. Усю эпапею сваю запісаў, акрамя... працы над падарункам. Чаму гэта стала тайнай нават ад жонкі? Больш — ад самога сябе. Сёння хто іншы на гэтым бы нажыў капітал». Сам Іван Мацвеевіч называе гэтыя ўспаміны «споведдзю», «блуканнямі па пакутах». Ён то «канспектыўна “прачытвае”», то «гартае свой рукапіс». У перадапошнім раздзеле аповесці галоўны герой яшчэ раз «прачытаў успаміны свой і «напісаў» апошні радок, які раней не пісаў нават у думках».

Гэты «ўспамін» Івана Мацвеевіча з'яўляецца своеасаблівай яго пакутай. Ён то «піша» яго, то «дапісвае», то «прачытвае». Аўтарскія двукоссі ў адпаведных кантэкстах часам блытаюць чытача: выразна не акрэсліваецца, ці гэтая «споведзь» аднаўляецца ў памяці галоўнага героя, ці ўпершыню выкладаецца як пэўная мемуарная форма «на паперы» яго свядомасці, каб потым перайсці на рэальную паперу.

«Не, гэты раздзел лагернага жыцця (стварэнне небяспечнага падарунка-помсты Сталіну.— *А. М.*) не будзе напісаны і не будзе агалошаны нікому. Пашкадаваў нават, што «пісаў» яго ў бяссонную ноч. [...] У апошнія гады палілася плынь «лагернай літаратуры» [...] Яго таксама прасілі напісаць. Яму не трэба пісаць — было напісана. Ён апублікаваў югаслаўскую частку і не даў піводнага радка пра лагер... Не, напісаць пра падарунак варта, але далёка схаваць ад блізкіх, каб і пасля смерці гэта не адразу знайшлі — пры жыцці Таццяны».

«Блуканні па пакутах» Івана Мацвеевіча — гэта раненне пад Ломжай у самым пачатку вайны, лячэнне на хутары пана Крыўца, шлях па акупаванай тэрыторыі да роднай вёскі, жыццё ў бацькоў да і пасля ачуньвання, сувязь з партызанамі, праца ў адпаведнасці з іх заданнем на чыгунцы, арышт чыгуначных рабочых і адпраўка іх у Германію, расстанне з бацькам, зняволенне ў Паўднёвай Аўстрыі, «работа ў падзямеллі» «ў выпрацаваных штольнях — будучых цэхах», уцёкі з нямецкага палону, лячэнне ў Паўлава, дзевяцімесячнае змаганне ў рускім партызанскім батальёне ў Югаславіі, сустрэча батальёна пад Бялградам з Савецкай Арміяй, кантузія, вяртанне дадому пад Новы год, рэакцыя на пастанову «Аб становішчы ў кампартыі Югаславіі» («Не веру я ў гэта») і арышт па даносе, допыты, зняволенне «ў Комі ў лагеры», праца ў Сыктыўкары ў засакрэчаным «лагеры» «ў групе, якая рабіла першую атамную бомбу», стварэнне падарунка Сталіну.

З усіх успамінаў і каментарыяў да іх галоўнага героя ўсё ж вынікае, што ён напісаў гэтую «споведзь» яшчэ раней, да моманту



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паўторнага фрагментарнага ўзнаўлення яе ў сувязі з хваробай дачкі. Як сведчыць прыведзены вышэй пералік фактаў гэтай «эпапеі», яна дастаткова разгорнутая ў тым варыянце, які фрагментарна ўзнаўляецца Іванам Мацвеевічам. І толькі падзеі датычныя падарунка Сталіну на сакрэтнай базе ён упершыню ўзнаўляе ў такой форме, якая можа быць абнародавана. Да гэтага Жыгуновіч не адважваўся гаварыць на тэму помсты вязняў-даследчыкаў Сталіну з дапамогай уманціраванага ў падарунак вусатаму кіраўнiку радыеактыўнага рэчыва.

Што ж нараджае такую нерашучасць галоўнага героя?

Найперш гэта боязь, страх агучыць у «споведзі» (у першую чаргу для родных) сваё дачыненне да зробленага падарунка Сталіну: яны могуць не зразумець, запатрабаваць пакаяння, а ён, «грэшнік», не зможа гэтага зрабіць. Разам з гэтым Іван Мацвеевіч асэнсоўвае сваю невінаватасць за наступствы свайго ўчынку, і ў той жа час ён адчувае, што пакараны за «тую сваю помслівасць»: «Аднойчы і я помсліва радаваўся, робячы такое, што магло адняць жыццё не ў немца, не ў фашыста — у свайго, не чалавека, у бога, на якога маліўся я, маліліся мільёны. За гэта я пакараны? За тую сваю помслівасць? Хто мог падумаць, што знешне бязвінная зброя стрэліць ледзьве не праз паўстагоддзе? Стрэліць у маю дачушку, у маю Леначку». У такой сітуацыі Жыгуновіч (ускосна, з дапамогай рытарычных пытанняў) спрабуе растлумачыць, чаму не пісаў раней пра падарунак Сталіну: перашкаджала адчуванне, што «пераступілі мяжу чалавечнасці, мяжу маралі, хрысціянскай ці іудзейскай». Нерашучасць Івана Мацвеевіча ў адносінах да ўзнаўлення ўжо цяпер, калі дачка хворая, у сваёй «споведзі» падзей, якія адносяцца да часу стварэння падарунка-бумеранга, звязана яшчэ і з тым, што ён адчувае ўласную віну ў сувязі з Аленінай хваробай, якая, паводле гэтага адчування, ёсць пакараннем за парушэнне ім хрысціянскага закона «Не забі!».

Такім чынам, у аповесці пераважае рэтраспекцыйны план падзей і іх ацэнка галоўным героем. Галоўнае ў творы — не сама тая трагедыя, якая разгарнулася ў сям'і Жыгуновічаў, а шлях да яе ў кантэксце лёсу мужа, бацькі і дзеда гэтай сям'і.

Нягледзячы на, здавалася б, безвыходныя абставіны ў сувязі з хваробай Алены, Жыгуновічы годна праходзяць гэтыя выпрабаванні бумерангам. Тут назіраем рэдкі выпадак у кантэксце аповесцей 1990-х гадоў, калі сям'я застаецца шчаслівай, якой яна і была да драматычнага здарэння: «...горла (Івана Мацвеевіча.— *А. М.*) распіраў салодка-горкі камяк, а вочы напоўніліся слязамі — слязамі шчасця. Ад такога ж шчасця грукала, без экстрасістал, сэрца Таццяны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Хведараўны: жыццё прадаўжаецца! Жыццё прадаўжаецца! «Дзякую табе, Святая Багародзіца»,— шаптала Маці».

Аповесць «Бумеранг» напоўнена пэўнай доляй надзеі ў тое, што лепшае ў жыцці ўсё ж перамагае. Галоўны герой твора ў думках выказвае меркаванне, што ён «не можа каяцца». У той жа час значную сэнсаўтваральную ролю ў аповесці выконваюць імкненні (апасродкаваныя) Івана Мацвеевіча да пакаяння, якое ён, прамаўляючы яго найперш для сябе, усё ж выносіць у быційную прастору. І такія намаганні Жыгуновіча маюць станоўчы вынік: яны спрацоўваюць, спрыяюць узнікненню лепшых абставін у плыні падзей рэальнага мастацкага свету аповесці.

У гэтых адносінах твор выгадна адрозніваецца ад іншых, напісаных І. Шамякіным у 1990-я гады. «Paradies auf Erden», «Вернісаж», «Сатанінскі тур», «Падзенне», «Адна на падмостках», «Без пакаяння» і іншыя напоўнены абсалютнай змрочнасцю — смерць, хваробы, здрада, помста, маральнае падзенне, безвыходнасць. Ствараецца ўражанне, што пісьменнік мэтанакіравана і абсалютна скандэнсавана пераносіў у аповесці тыя факты з рэчаіснасці, якія стваралі б эфект сацыяльнага і маральнага беспрасвецця і безвыходнасці.

Сапраўды, у 1990-я гады існавала адчуванне катастрафічнасці жыцця. Было не толькі адчуванне яе, але і выразныя праявы грамадскага бязладдзя. Аднак побач з тым існавалі і ўзвышаныя формы жыцця. Урэшце гэтае ўзвышанае ў пэўных абставінах (хай сабе і ў лакальным маштабе) перамагала. Яно (у жыцці і старэйшага пакалення, і малодшага) пераходзіла затым у новы час. Беларусь пачатку XXI стагоддзя, напрыклад, трымаецца, акрамя іншага, яшчэ і на захаваным і выхаваным у 1990-я гады маральным патэнцыяле. Для рэцыпіента XXI стагоддзя таму шмат у чым можа быць незразумелы такі аднамерны падыход І. Шамякіна да адлюстравання разбуральнай рэчаіснасці канца XX стагоддзя. Здавалася б, мастацкая абсалютызацыя змрочнасці павінна выконваць, акрамя іншага, адпаведную эстэтычную функцыю, як гэта ні парадаксальна гучыць. У І. Шамякіна ж такая абсалютызацыя дамінуе, яна часам разбуральна дзейнічае на свядомасць рэцыпіента. Яна не спрыяе знікненню горшага ў свядомасці чытача, а ўмацоўвае яго веру ў безвыходнасць.

Разам з тым варта такія меркаванні дапоўніць і наступнымі высновамі. Празаік зыходзіў з таго (і гэта выразна акрэслена ў яго дзённікавых запісах «Роздум на апошнім перагоне...»), што татальнае разбурэнне старых ідэалаў і адсутнасць маральнага падмурка для новых — гэта шлях у сацыяльны экзістэнцыйны вакуум. Грамадства, у якім ранейшыя стваральнікі яго дабрабыту знаходзяцца



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на жабрачай сацыяльнай прыступцы, у якім пажылы, стары чалавек павінен ісці на маральныя барыкады ў змаганні за кавалак хлеба, у якім учарашні ідэалагічны лідар становіцца пярэваратнем, павінна мець свайго і абвінаваўцу, і суддзю, і абаронцу. Магчыма, залішне катэгарычнага, магчыма, здольнага да абсалютызацыі, але паслядоўнага і з болем у сэрцы за гэтае грамадства. У гэтым сэнсе ролю такога суддзі і абаронцы і ўзяў на сябе І. Шамякін.

У той жа час варта звярнуць увагу і на яшчэ адну асаблівасць рэцэпцыйнага функцыянавання аповесцей пісьменніка 1990-х гадоў. Гэтыя творы катэгарычна неаднолькава ўспрымаюцца і ацэньваюцца рознымі групамі чытачоў. Асабліва тут звяртае на сябе ўвагу аповесць «Выкармак». У ёй у кантэксце грамадска-палітычных супярэчнасцей другой паловы 90-х гадоў XX стагоддзя дастаткова выразна прадстаўлены катэгарычны погляд пісьменніка на разбуральныя праявы жыцця праз прызму ўзыходжання на беларускі палітычны алімп галоўнага героя аповесці Уладлена Супца.

Сярод вялікай чытацкай аўдыторыі можна вылучыць некалькі асноўных тыпаў успрымання названых тэкстаў[1].

Першы і другі тып ахопліваюць рэцыпіентаў, што былі ў той ці іншай меры сведкамі, назіральнікамі, удзельнікамі адлюстраваных у аповесці падзей; адны з іх прымаюць аўтарскія палітычныя сімпатыі, антыпатыі, ацэнкі, што прадстаўлены ў аповесці, другія ж альбо бяруць пад сумнеў, альбо ўвогуле адпрэчваюць іх, бо маюць свае, дастаткова трывалыя, а то і балючыя сведчанні пра тое, што адлюстраваў пісьменнік на ўзроўні грамадскага факта, падзеі, непасрэднай альбо ўскоснай ацэнкі. Трэці тып успрымання звязаны з «недасведчаным» чытачом. Такая «недасведчанасць» можа быць выклікана рознымі фактарамі: пасіўнай грамадзянскай пазіцыяй цяперашняга чытача ў 1990-я гады, яго нежаданнем засяродзіцца на асэнсаванні сутнасці таго, што адбывалася ў грамадстве. Чацвёрты тып тоесны чытачу, для якога адлюстраваныя ў аповесці грамадскія падзеі не што іншае, як цьмяная гісторыя, калі ўлічыць неадназначныя, а то і супярэчлівыя (пачынаючы з другой паловы 90-х гадоў XX стагоддзя) іх ацэнкі ў сродках масавай інфармацыі, у навукова-папулярных і навуковых публікацыях.

Абсурднасць адпаведных грамадскіх падзей у мастацкім іх адлюстраванні І. Шамякіным патрабуе дадатковых тлумачэнняў, асабліва на ўзроўні *грамадскі тып — прататып (рэальны і агуль-*

[1] Заўважым пры гэтым, што такі падзел умоўны, бо калькі, схемы, матрыцы не заўсёды спрацоўваюць там, дзе маем справу з суб'ектыўным у мастацкім творы, а тым болей у чытацкай прасторы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*ны) — аб'ектыўнае і суб'ектыўнае ў адлюстраванні грамадскіх працэсаў, палітычных падзей 1990-х гадоў* і інш. А гэта ўжо тэма і праблема асобнага навуковага даследавання, без якога, думаецца, ацэнкі творчасці І. Шамякіна гэтага перыяду будуць няпоўнымі і аднабаковымі.

Звернемся да асэнсавання мастацкага свету аповесцей «Партрэт» і «Выкармак» безадносна магчымых ацэнак яго прадстаўнікамі той ці іншай з вылучаных вышэй чытацкіх тыпаў. Падобнае выклікана, паўторымся, неабходнасцю правядзення спецыяльнага — больш разгорнутага, доказнага, гісторыка-супастаўляльнага — даследавання.

У аповесцях І. Шамякіна «Без пакаяння», «Бумеранг», «Выкармак», «Крывінка» ў розных кантэкстах так ці інакш утрымліваюцца ацэнкі пісьменніка (непасрэдныя, апасродкаваныя) адносна рэчаіснасці, у якой разгортваюцца тыя ці іншыя падзеі адносна гісторыі, рэлігіі, веры і г. д. Найбольш скандэнсавана ў іх ўзаемадапаўняльнасці, а то і палярнасці яны пададзены ў аповесці «Партрэт».

Большая частка падзей і характараў твора не ўпісваецца ў агульную атмасферу змрочнасці, гвалту, забойстваў, маральнага падзення герояў з іншых аповесцей І. Шамякіна гэтага перыяду. У рэальнай падзейнай прасторы аповесці нібыта пануе ідылія, спакой, паразуменне, павага паміж героямі. Сюжэт «Партрэта» вызначаецца яго прастатой у параўнанні з іншымі аповесцямі І. Шамякіна. Падзеі ў асноўным разгортваюцца на дачы пісьменніка Фантаста (Ігара Варлаамавіча) — «палацы», які «збудаваў» яго ўнук-прадпрымальнік Пятрусь. Менавіта ён арганізаваў «клуб старпёраў», як называў сваіх таварышаў-камуністаў Ігар Варлаамавіч. Дзеля чаго? Каб тут, у гэтым утульным месцы яны «сербанулі з капіталістычнай піялы» выгоды новага адносна бесклапотнага жыцця. «Прадстаўнік новага класу», трыццацігадовы Пецька, які «ўмее рабіць грошы з паветра», праяўляе, як паказана ў аповесці, выключную ўвагу і павагу да дзеда, яго таварышаў, сваёй сям'і. З аднаго боку, такі факт успрымаецца як ненатуральны (надуманы) у кантэксце маральнай зніжанасці іншых герояў-прадпрымальнікаў з твораў І. Шамякіна. З другога ж боку, гэты ўчынак Пятра трымаецца на значным маральным падмурку (на гэта, праўда, у аповесці не акцэнтуецца ўвага): на сямейным выхаванні, якое, трэба меркаваць, было адпаведным статусу дзеда (пісьменнік) і бацькі (Андрэй Ігаравіч — «членкар»). Тым не менш «клуб старпёраў» паволі і адносна бестурботна рухаецца наперад. Галоўная падзея аповесці — стварэнне жывапісцам Ціханам «калектыўнага партрэта». Гэтым самым мастак «дыхнуў у



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«клуб» новае жыццё». Пісьменнікі Павел Пятровіч, Фантаст (Ігар Варлаамавіч), былы сакратар ЦК (Аляксандр Аркадзьевіч), былы Прэм'ер і іншыя ўдзельнікі «клуба» сабраліся ў чарговы раз на дачы Фантаста не толькі дзеля пазіравання для партрэта. Найперш — для таварыскіх зносін, у час якіх абмяркоўваюцца праблемы веры, духоўнасці, марксізму, палітыкі, гісторыі... І калі ў іншых аповесцях пісьменніка адносна ўсяго гэтага даюцца пераважна паасобныя тэзы, перакананні герояў, то тут заўважаецца імкненне аўтара звязаць усё ў адзін ланцуг і выбудаваць нейкую плынь шырокага філасофствавання па праблемах духоўнага і грамадскага быцця. Пры гэтым назіраем імкненне празаіка ў непасрэднай форме адлюстраваць уласныя погляды на гэтыя праблемы. Наколькі ўдалая такая плынь філасофствавання паводле яе формы і зместу — гэта ўжо іншая гаворка...

Калектыўны партрэт, праца над якім была «ў пачатковай стадыі», мусілі ажывіць дзве асобы: Фантастава нявестка Ружа і яе сын Янка. У такім намеры жывапісца бачыцца сімвалічны сэнс: сярод «шасці сілуэтаў» — постаці маці і дзіцяці, а таксама вобраз Генерала (нават не вобраз, а толькі белая пляма яго мундзіра) як абаронцы самага значнага на Зямлі: мацярынскай самаахвярнасці, любові, сыноўняй дзіцячай шчырасці. Аднак такі партрэт застаўся незакончаным. Ён далучаецца да шэрагу іншых шамякінскіх партрэтаў разбуральнай рэчаіснасці. Ружа здраджвае мужу (таму, хто наладзіў гэты райскі куток для старых людзей); сын (клапатлівае маленькае стварэнне) убачыў матчына грэхападзенне і потым перад «аслупянелай» ёй і такімі ж дзядамі горача выкідвае сваё абвінавачванне; Пятро (меў намер падумаць, перш чым прыняць канчатковае рашэнне адносна здрады Ружы) раптоўна забівае жонку-здрадніцу. Такім чынам, і ў дадзеным выпадку аўтар перакрэсліў магчымасць шчаслівага існавання сем'яў «прадстаўнікоў новага класа».

Фінальны абзац аповесці гучыць безнадзейна. Валянціна Хведараўна — жонка Фантаста — захоўвае недапісаны партрэт. На ім няма ўнука (Пятра), ледзь «можна пазнаць» Фантаста і Янку. Аднак «закончана напісана Ружана». І зноў на першы план выразна выходзіць змрочнае, а вартаснае апынаецца ў цені альбо ўвогуле адсутнічае.

Падзеі рэальнага мастацкага свету аповесці «Выкармак» адбываюцца ў Мінску, пачынаючы з канца 1980-х, на працягу некалькіх (каля трох) гадоў. У эпілогу ж акрэсліваюцца вызначальныя факты ў жыцці Уладлена Супца «праз няпоўныя два гады», калі ў «часе прэзідэнцкіх выбараў» ён «зрабіў стаўку на маладога кандыдата»



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і «атрымаў у Кабінеце Міністраў прасторны кабінет з урадавымі тэлефонамі, прыёмнай і маладой сакратаркай, якой неўзабаве зрабіў дзіця». Імкнучыся ўзысці на адпаведную парадам яго маці і ўласным памкненням высокую палітычную прыступку, галоўны герой аповесці актыўна ўдзельнічае ў рознага кшталту грамадскіх падзеях. Некаторыя з іх увайшлі ў гісторыю Беларусі як знакавыя праявы грамадскага жыцця постсавецкага перыяду: масавая дэманстрацыя памяці ахвяраў сталінізму ў Курапатах («Дзяды-88», 30 кастрычніка 1988 года), якая была разагнана ўладамі з выкарыстаннем дубінак і слёзатачывых газаў; выбары ў Вярхоўны Савет Беларусі (1990); «два мітынгі» «на плошчы» (з «патрабаваннем ад Вярхоўнага Савета абвяшчэння незалежнасці» — на адным, і «ўслаўленнем Савецкага Саюза, савецкай улады» ветэранамі — на другім); абмеркаванне «развалу» СССР у Вярхоўным Савеце і інш. У аповесці дзейнічаюць палітычныя лідары, за якімі ўгадваюцца адпаведныя асобы, што так ці інакш уплывалі на грамадскую думку, жыццё канца 80-х — пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Гэта «лідар апазіцыі» і згуртавання «Пагоня», дэпутат Вярхоўнага Савета Антон Адамавіч Пухнач (Зянон Пазняк — старшыня БНФ), былы «старшыня саўгаса» (у іншым вызначэнні «старшыня калгаса»), у пэўны перыяд сябра згуртавання «Пагоня» і ў той жа час «заразны бальшавік», таксама дэпутат Вярхоўнага Савета Аляксандр Георгіевіч Палетка (Аляксандр Лукашэнка). Згадваецца ў адпаведным кантэксце Старшыня Савета Міністраў БССР (потым незалежнай Рэспублікі Беларусь) у 1990—1994 гадах Вячаслаў Кебіч (яго «неаднойчы заганяў у кут» на пасяджэннях «парламента» Уладлен Супец); падобным чынам робіцца адсылка да асобы Мікалая Дземянцея — Старшыні Вярхоўнага Савета БССР у 1990—1991 гадах, пад старшынствам якога Вярхоўны Савет БССР у 1990 годзе прыняў Дэкларацыю аб суверэнітэце Беларускай ССР: «Любіў (Уладлен.— *А. М.*) слухаць сябе і глядзець на сябе: малады, прыгожы, трыбун, голас прыемны, мова беларуская натуральная, не тое, што ў некаторых, якія імкнуцца выступіць па-беларуску, а атрымоўваецца трасянка, а то і зусім такія ляпы, як у старшыні, двухсэнсоўнасці, з якіх смяецца ўся інтэлігенцыя: “Не стойце там у заднім праходзе”». Паколькі Уладлен Супец, акрамя палітычнай кар'еры, імкнецца зрабіць яшчэ і кар'еру пісьменніка, то ў аповесць уведзены і вобразы пісьменнікаў, з якімі мае зносіны галоўны герой і якім імкнецца адпомсціць за іх неразуменне яго і няўдзячнасць яму. Гэта найперш вобразы «двух Іванаў, былых старшынь Вярхоўнага Савета», за якімі ўгадваюцца асобы І. Шамякіна і І. Навуменкі, а таксама вобраз «Івана магілёўскага» (Івана Чыгрынава) і інш.

У цэнтры аповесці — Уладлен Супец — старэйшы сын Ульяна Мацвеевіча Супца, уплывовага ў партыйных колах чалавека,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

які з'яўляецца «кіраўніком справамі высокага камітэта» (ЦК КПБ), «трыццаць пяць гадоў служыў партыі».

Кароткія рэтраспекцыі аповесці акрэсліваюць шлях галоўнага героя да вялікай палітыкі.

Калі ўлічыць, што ў пачатку рэальных падзей твора яго галоўнаму герою трыццаць гадоў, то можна зразумець, чаму, праслужыўшы пяць гадоў партыі, яго бацька, Ульян Супец, менавіта так назваў свайго першынца: Уладлен — папулярнае ў паслярэвалюцыйны час імя з дзвюх частак, якое падразумявае Уладзімір Ленін. У такім выбары, напэўна (хоць на імені галоўнага героя пісьменнік ніякім чынам не акцэнтуе ўвагу і не падае рэтраспекцыйныя факты, звязаныя з яго выкарыстаннем), меўся свой погляд у будучыню: ужо гэтым, відаць, Уладлену быў своеасабліва намечаны шлях у палітыку. Сапраўды, бацькі як у ваду глядзелі. Даўшы такое імя першаму сыну, яны потым умела ўзводзілі Уладлена на адпаведныя прыступкі палітычнай кар'еры. Найперш у гэтым плане вылучалася маці, Марыя Якаўлеўна,— «сціплы» бухгалтар банка. Яе пазіцыя ў сям'і — актыўна «ўсіх павучаць». «Мамачка-прарочыца» вельмі добра адчувала, калі і ў якім кірунку «трэба мяняць курс», каб дасягнуць сямейнікам, найперш дзецям, адпаведных вышынь. І нават калі Уладлен стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета, яна падказвала яму, «па якой струне ўдарыць», «каб прагучала мацней ці ў патрэбным тоне». Але гэта будзе пазней як вынік той апекі, пад якую паслухмяна аддаў сябе маці яе старэйшы сын.

У «дзясятым класе ён пахаваў мару пра факультэт журналістыкі. Няхай жыве эканоміка!» Так пачаўся актыўны працэс будавання светлай будучыні сына: «Вуля (так звярталася Марыя Якаўлеўна да мужа.— *А. М.*), я яшчэ ні разу не памылялася. У мяне нюх. Я зрабіла цябе. Я зраблю сына. Мой план абсалютна рэальны: студэнт — сакратар камітэта курса, дыплом эканаміста — райкам камсамола... Далей — партшкола...» Маці «рабіла» сына парадамі, а бацька «падсаджваў» яго ў адпаведныя цёплыя месцы ў працэсе рэалізацыі гэтых парад. І так адбывалася ажно да «вялікай перабудовы», калі і сын, і маці адчулі, што партыйная кар'ера (на гэты час Уладлен быў сакратаром райкама камсамола) болей не прынясе вялікай карысці.

Такім чынам, сям'я Супцоў, акрамя дасягнення кар'ернага росту дзецьмі, збірання капіталу і ператварэння яго ў нерухомасць, не мела, па вялікім рахунку, ніякага клопату. Высокае становішча ў партыйным кіраўніцтве бацькі, выключная карыслівасць бухгалтаркі-маці, паслухмянасць у справе здабывання службовых пасад сынамі, рахманасць нявестак, дабрабыт, сямейны спакой — вось галоўныя паказчыкі сямейнага існавання Супцоў у пачатку аповесці.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Рэальны мастацкі свет твора — гэта ўзыходжанне галоўнага героя на палітычны і пісьменніцкі алімпы. Узыходжанне на першы з гэтых алімпаў стала паспяховым: Уладлен быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, а потым (пасля прэзідэнцкіх выбараў) атрымаў пасаду ў Кабінеце Міністраў. Спроба ўзыходжання на другі алімп пацярпела няўдачу: у Саюз пісьменнікаў ён так і не прайшоў, напісаныя ім творы так і засталіся непрызнанымі, невядомым, урэшце, аказаўся і лёс яго аповесці «Іваны».

Маючы схільнасць да літаратурнай дзейнасці, Уладлен у пачатку творчасці, яшчэ будучы камсамольскім лідарам, напісаў аповесць «Герой свайго часу». У ёй ён стварыў вобраз «ідэальнага камсамольца, вернага сына вялікай партыі, вучня Леніна, адданага яго ідэям», «напісаў сябе». І потым, у якія грамадскія зносіны ні ўступаў бы Уладлен Супец, ён імкнуўся быць героем у іх. Якая ж сутнасць гэтага «героя», паводле аўтарскага погляду на яго?

Адчуўшы, што «змагацца» ў час перабудовы за «прыкметнае месца ў партыйных структурах не свеціць», Уладлен даволі рашуча адмаўляецца ад ранейшых сваіх ідэйных арыенціраў і адпаведнай ім дзейнасці. Пры гэтым варта заўважыць, што камсамольскім героем ён быў толькі знешне, па сутнасці ж, яго захаплялі найбольш выгоды, якія давала камсамольская праца: магчымасць вольнага часу, камсамольскія сабантуйчыкі і г. д. У новых грамадскіх умовах Уладлен рашуча выкрывае на пленуме гаркама камсамола «балотную застойнасць», «страту пачуцця нацыянальнага патрыятызму», выступае на перадвыбарчым сходзе «аб прывілеях партнаменклатуры», хоць сам, паводле вызначэння бацькі, «з пялёнак плавае ў гэтых прывілеях», супрацоўнічае з апазіцыйным рухам «Пагоня», удзельнічае ў шэсці да Курапат. І неўзабаве адбылося наступнае: Уладлен імкліва «прыскакаў у Авальную залу Дома ўрада», «трыумфам першага дня» яго знаходжання ў гэтай зале было атрыманне ім пасады «намесніка старшыні камісіі... па новых мерках — намесніка міністра». Дзеля дасягнення сваіх мэт ён дэманстратыўна імкнецца ў час мітынгу «апаганіць» помнік Леніну (дарэчы прынцыповую прагматычна-маральную ацэнку гэтаму ўчынку сына даў бацька: «Боўдзіла бязмозглае! Ленін і цябе і мяне ў людзі вывеў. Пасвілі б мы свіней. А ты... Знайшлі метад ідэалагічнай барацьбы — апаганіць помнік! Фашысты разумней рабілі. Такія вашы метады адвернуць ад вас народ. Так і скажы свайму Пугачу»), адмаўляецца ад партыйнага білета на пленуме райкама партыі, гэтым самым падкрэсліваючы, што партыя і яе лінія не адпавядаюць яго інтарэсам як чалавека, які дбае пра лепшую будучыню свайго народа.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Уладлен разумее, што моцна дапамагчы ў яго змаганні за палітычную кар'еру можа супрацоўніцтва з апазіцыйным рухам «Пагоня», якім кіраваў Антон Пухнач, таксама дэпутат Вярхоўнага Савета. Гэта асобная старонка яго палітычнай біяграфіі. Аднак і тут ён выступае як прыстасаванец і двурушны сябра «паганякаў», што асабліва выразна выяўляецца ў час пасля падзення ГКЧП у Расіі і абароны Белага дома ў Маскве: у такой няпэўнай сітуацыі не варта відавочна адмаўляцца ні ад адных (камуністаў), ні ад другіх (дэмакратаў): «У Заходзькі на кватэры сабралася чалавек пяць — незнаёмых, маладых. Гаспадар прывітаў Уладлена радасна.

— Ты нам во як трэба! У Мінску пакуль што спакойна. Але ж мы, як сказаў Алесь, Вандэя. Камуністы паспрабуюць узяць рэванш, не сумняваюся. Трэба даць ім бой, як у Маскве. Збіраем дружыну баявых хлопцаў. Хочам, каб ты ўзначаліў. [...]

— Які я камандзір? Знайдзі вайскоўца. А сябе я назначаю ў разведку. Пайду да бацькі. А ў кіраўніка справамі — увесь штаб, уся інфармацыя, уся сувязь. Праз бацьку я выведаю ўсё, што імі плануецца, што робіцца ў ЦК, у гаркаме.

Заходзька лёгка згадзіўся: мець такога разведчыка — козыр.

І Уладлен хутчэй кінуўся да бацькі — далей ад гэтых авантурыстаў! Пад бацькавым высокім дахам — зацішна і бяспечна. А калі ўбачыць, што паварочваецца па-маскоўску, то тады — ад бацькі нешта даведаецца і зробіць паслугу сваім. У такой сітуацыі лепш быць і там і там — і з бацькам і з Пухначом».

Аўтар у той жа час звяртае ўвагу на такія маральныя якасці свайго героя, як сумленне і непадкупнасць. Аднак пры гэтым варта паглядзець на маральныя ўстаноўкі і сацыяльныя ўмовы, на якія арыентаваўся Уладлен Супец пры выпрацоўцы гэтых якасцей і імкненні іх захаваць.

У сітуацыі, калі многія «народныя выбраннікі», якія мелі «пасады ў Саўміне, міністэрствах, аблвыканкамах, райвыканкамах» і «ўзбагачаліся самым «бяскрыўдным» спосабам: бралі хабары», Уладлен Супец удаваў сябе за «аднаго з нямногіх», бо быў «сумленным і непадкупным», жыў на дэпутацкі заробак. Адкуль такая прынцыповасць? Супец збірае факты для выкрыцця ў парламенце хабарніцтва — вось што найперш рухае такімі яго арыентацыямі на «праведную» пазіцыю палітычнага дзеяча. Пры гэтым зайздрасць робіць сваю справу. Бо як жа? Іншыя дэпутаты раз'язджаюць на службовых шыкоўных машынах, а ў яго такой няма: «Чым я горшы? Я — лепшы». І тут прынцыповасць і сумленне адыходзяць у маральныя прыцемкі. Уладлен выкарыстоўвае сваё дэпутацкае становішча: едзе нібыта ў службовую камандзіроўку ў Германію. На самай жа



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

справе мэта такой паездкі — набыццё машын: сабе і бацьку. Праўда, за ўласныя грошы. Прынцыповасць? Нібыта так, але толькі напалову: выкарыстоўваецца пры гэтым усё тое ж дэпутацтва ва ўласных мэтах. Але і гэта не галоўнае. Тут у ход ідуць сродкі, прыдбаныя бацькам пры дапамозе яго службовага становішча,— грошы, якія ён «хапнуў... і без натугі ўвайшоў у новы “клас”». Больш за тое, такая Уладленава «сумленнасць» мела і яшчэ адзін матэрыяльны падмурак. Іншыя дэпутаты, «змагары з прывілеямі былой партыйнай эліты», разумелі, што аднымі спрэчкамі ў парламенце не заробяць сабе фінансавы капітал, пасля заканчэння дэпутацкіх паўнамоцтваў «вылецяць з Авальнай залы голенькімі». Таму і імкнуліся яны нажыць гэты капітал пры дапамозе ўсё тых жа хабараў. Для Уладлена такая боязь не была актуальнай: бацькі, выкарыстоўваючы службовае становішча («Сапраўды, не промах верны камуніст Супец,— усё яшчэ са злой іроніяй думаў Уладлен.— За тыя грошы, што ён выграб пры мне (з партыйнага сейфа.— *А.М.*), магазін не купіш. Значыцца, не раз залез у скарбонку. Хе! Маці ж была ў банку. Кіраўнік справамі мог залезці і ў банкаўскі сейф. Партыя ж развалілася за лічаныя дні»), назбіралі дастаткова грошай і для сябе, і для дзяцей, і для ўнукаў (прыгадаем: бацька «арганізаваў камерцыйную структуру, выдавецкую», маці адчыніла краму, абое паспяхова пачынаюць прыватызацыйную дзейнасць, будаўніцтва катэджа для Уладлена і Леаніда). Тым не менш ён, такі «сумленны і непадкупны», выпешчаны на ўлонні дабрабыту, дасягнутага службовым становішчам бацькоў, «збіраў факты, каб нанесці ўдар (у парламенце.— *А. М.*) па хабарніках». Пры дапамозе такіх і падобных сюжэтных сітуацый аўтар паступова падводзіць чытача да разумення сутнасці галоўнага героя як сацыяльнага тыпа: выкармак.

Побач з такім напорыстым імкненнем да барацьбы за «сацыяльную справядлівасць» у той жа час у свядомасці галоўнага героя назіраем паступовы адыход ад адчування страху. Калі даўней «сур'ёзнай запрудай для яго вар'яцкіх учынкаў заўсёды было адно — страх: крымінальная адказнасць, раней — боязь быць выключаным з партыі», то пасля абмеркавання планаў будаўніцтва вялізнага катэджа (могуць абвінаваціць у карупцыі), здзяйснення граху з братавай (могуць даведацца маці, брат, жонка) страх і трывога паступова знікаюць. Яго «сумленне ціха стаілася і ні разу не кальнула»,— такое самавызначэнне маральнага стану ў адносінах да здзейсненага граху з братавай жонкай можна спраецыраваць і на іншыя ўчынкі галоўнага героя аповесці.

Паказальнай якасцю характару Уладлена Супца ў перыяд яго дзейнасці ў Вярхоўным Савеце была помста. Праўда, аўтар зна-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чае ў кантэксце характарыстыкі яго адносін да «пухначоўцаў» («паганякаў»), што ён «не любіў... шукаць ворагаў». Тым не менш час ад часу галоўны герой у думках пракручвае адпаведныя пэўным сітуацыям спосабы помсты тым людзям, якія так ці інакш не прызнаюць значнасці і самадастатковасці яго асобы.

Схільны да літаратурнай творчасці, ён спрабуе ўзабрацца на алімп прыгожага пісьменства. Але і тут, нягледзячы на тое, што час ад часу літаратурная творчасць яго сапраўды захапляе, вызначальным для Уладленавых памкненняў ёсць наступны прынцып: даказаць, што ён нечага варты ў літаратуры, стварыць нешта такое, што ўзвысіла б яго ў вачах калег-пісьменнікаў. Здавалася, прызнанне вось-вось прыйдзе, бо Супец быў ужо за адзін крок ад прыёму ў Саюз пісьменнікаў. Але гэтага на самым апошнім этапе (галасаванне ў прэзідыуме СП) не адбылося. І ў такім спіхванні яго, пісьменніка Уладзіміра Ступеня, з лесвіцы, што магла прывесці да здзяйснення стратэгічных планаў, Уладлен стаў вінаваціць Іванаў-пісьменнікаў.

Ён пачаў пісаць новую аповесць, «злую, сатырычную — пра старых Іванаў, палітычных і літаратурных», якую так і назваў: «Іваны»: «...было жаданне адпомсціць канкрэтным людзям — Іванам, якія не прагаласавалі за яго прыём; два Іваны — члены ЦК, няхай і на іх упадзе цень». На іх, «жывых класікаў», і «выплёскваў» Уладлен Супец «і злосць, і боль».

Помсціць галоўны герой і роднаму брату «за знявагу яго будаўнічых клопатаў». Пры гэтым выбраў тую форму помсты, якая надзвычай узбуджала: сексуальныя зносіны з братавай жонкай. І калі Уладленава помета пісьменнікам у творы застаецца безвыніковай (невядома, ці скончыў галоўны герой тую аповесць і якой яна атрымалася), то помста брату і муляру Ранту з катэджа прыносіць хоць і нязначнае, але пакаранне галоўнаму герою (развёўся з жонкай; заплаціў грошы за бойку з Рантам).

Жаданне помсціць у свядомасці Уладлена перакрыжоўваецца з яшчэ адной устаноўкай ва ўжо «прафесійнай» яго дзейнасці як дэпутата, які «рашуча пайшоў у бой за шчасце народа»,— «сцёбнуць» каго-небудзь на сесіі Вярхоўнага Савета дзеля дасягнення папулярнасці, бо народ такое любіць: «Чым больш аплявуха, тым больш воплескаў!»

З дапамогай найперш бацькоў, выкарыстоўваючы службовае становішча ў камсамоле, эксплуатуючы ў сваіх мэтах партыйную дзейнасць, затым — дэпутацтва і супрацоўніцтва з апазіцыйным згуртаваннем «Пагоня», Уладлен Супец ажыццяўляе тыя свае планы, якія дазволілі яму ўзняцца ў «завоблачныя вышыні». Аднак пры такіх абставінах яго сацыяльнага ўзвышэння ён у той ці іншай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ступені здраджвае тым, хто дапамог яму ў гэтым. Адкрытая маральная ацэнка такой пазіцыі галоўнага героя была дадзена ўпершыню на пленуме райкама партыі, калі Супец «палажыў партбілет на стол прэзідыума»: «“Выкармак!” Гэтае слова чамусьці ўразіла і спалохала, бо пачуў яго ўпершыню».

У той жа час галоўны герой аповесці пасля таго, як газеты «распісалі факт яго выйсця» з партыі, «цешыўся: вось ён — я». Ён стаў «фігурай».

Другі раз такая характарыстыка для Уладлена прагучала з вуснаў яго маці, пасля таго як ён абразіў яе, сказаўшы як аргумент на яе заўвагу (звязаўся з «прастытуткай»), што жанчыны «ўсе аднолькавыя». І тут Уладлен адчувае брыдкасць такой характарыстыкі. У той жа час ён хутка знаходзіць сабе апраўданне: не ён вінаваты ў такой яго пазіцыі, а бацькі: «Як назвала мяне маці? Як? Пачакай... Выкармак? Так і сказала — выкармак, па-беларуску. Не выкормыш, лягчэй усё ж. А выкармак. Якое брыдкае слова! Не матчына — цешчына слова. Так сказаць магла толькі цешча. Напэўна, скажа. А як ты магла, мама? Хто мяне выкарміў? Вы, вы! Ты з бацькам. Рабілі камуніста, цяпер робіце капіталіста. Кан'юнктуршчыкі вы!» У іншым месцы твора такое вызначэнне-апраўданне ўдакладняецца наступным чынам: ён «выкормліваўся» ў абстаноўцы «псіхалагічнай усёдазволенасці», і яна яго «штурхала на авантурныя ўчынкі».

Своеасаблівым апасродкаваным сацыяльным папярэджаннем у кантэксце адзначанага вышэй гучыць эпілог аповесці. У сувязі з гэтым узнікаюць наступныя рытарычныя пытанні. Якім будзе далейшы шлях падобнага ўрадавага кіраўніка ў адносінах да тых, хто «выкарміў» і выпусціў яго на гэтую пляцоўку сацыяльнага верхаводства? Хто стаў паплечнікам Аляксандра Палеткі?.. І зноў жа адказы на гэтыя пытанні могуць быць як адназначнымі, так і развітымі ў залежнасці ад таго, прадстаўнік якога рэцэпцыйнага тыпу (яны вызначаны ў пачатку характарыстыкі твора) будзе адказваць на іх. У гэтым, акрамя іншага, і заключаецца своеасаблівасць сацыяльнага прызначэння гэтай аповесці.

Тэма *выкармак і асяроддзе, якое спрыяе яго ўзгадаванню*, паўтараецца І. Шамякіным у аповесці «Крывінка». Але калі ў папярэднім творы гэтая тэма развіваецца ў кантэксце уплываў «выкормлівання» найперш на грамадскія зносіны, то ў названым яна паглыбляецца на прыкладзе прыватнага жыцця: непасрэднай ахвярай тут становяцца тыя, хто ўзгадаваў сваю «крывінку» жорсткай, безаглядна прагматычнай і эгаістычнай асобай. Гора бацькоў Галаванаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

хоць і працяглае, але часовае. Самае ж страшнае ў дадзеным выпадку тое, што гора ўскоснай ахвяры «выкормлівання крывінкі» — сям'і Навагодава, забітага Георгіем Галаванам, абсалютнае. Невінаватага ні ў чым Навагодава ўжо не вернеш, якім бы чынам яго заказчык-забойца ні замольваў свой гэты страшны грэх. «Выкармленая» ж «крывінка» пры гэтым застаецца зноў ласкава прынятай і прыгалубленай, хоць гэта менавіта яна стала прычынай таго, што яе бацька «заказаў» забойства яго даўняга сябра.

Падзеі аповесці адбываюцца на дачы «прэзідэнта дзвюх фірм — «Амон» і «Бамонд» — Георгія Галавана», у яго офісе, у міліцыі, на кілеравым хутары. Разгортванне сюжэта твора звязана ў асноўным з двума галоўнымі фактамі: «асвячэннем» катэджа-дачы Георгія Галавана, а таксама знікненнем (двойчы) яго дачкі Арыядны. Як вынік гэтага — пошукі дачкі і помста бацькі (паводле яго і жончынага пераканання) віноўніку яе знікнення і, магчыма, смерці — Навагодаву, даўняму сябру Галавана.

У пачатку аповесці Галаванаў сусед па дачным пасёлку — драматург Іпаліт Пятровіч — мяркуе напісаць п'есу пра суседскі басейн, у якім і адбываліся б падзеі. Ён як у ваду глядзеў. Сапраўды, уся інтрыга наступных пасля «асвячэння» катэджа падзей разгортваецца менавіта пасля прыкрага здарэння ў басейне, калі Арыядна «пацягнула за сабой» у час купання апранутага Навагодава. Гэты басейн неаднойчы згадваецца як прычына варожасці паміж Галаванамі і Навагодавым, як меркаваная прычына помсты Навагодава дачцэ Галаванаў. Менавіта ў басейне амаль у самым фінале аповесці жадае развітацца з жыццём Георгій Галаван, які зразумеў, што па яго заказе быў забіты невінаваты чалавек, некалі яго сябар.

«Два гады назад», як «выказаўся сярод сваіх блізкіх» Навагодаў, Галаван «"нагрэў" яго на аперацыі з саляркай», што паслужыла прычынай іх непаразумення, хаця ў пачатку аповесці яны захоўваюць таварыскія адносіны. Галаван жа рэпрэзентуе сябе як «сумленнейшага прадпрымальніка». У далейшым такія характарыстыкі — ён сумленны і клапатлівы прадпрымальнік — развіваюцца і паглыбляюцца ў аповесці: «І працую на сябе. Але дзеля людзей, каб ім лепш жылося».

Галаван просіць, напрыклад, у міністра дзяржмаёмасці Мураўя прадаць яму ваенны гарадок «Бужскі» дзеля будаўніцтва там свайго прадпрыемства, вакол якога ён створыць рабочым «сацыялістычны рай». Аднак пры гэтым у сваіх довадах ён выводзіць на першы план уласны прыбытак-узбагачэнне, што для прадпрымальніка натуральна. Толькі ж «сацыялістычны рай» пры гэтым не што іншае, як танны антураж і мінімальны клопат пра рабочых, без якога паспяховая



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вытворчасць не зможа быць наладжана. Урэшце ён набывае гэты гарадок пасля знікнення-ўцёкаў Арыядны з каханкам і яе вяртання.

Ствараецца такое ўражанне, што меркаванне І. Шамякіна, зафіксаванае ў яго дзённікавых запісах «Роздум на апошнім перагоне...» адносна нараджэння новага тыпу прадпрымальнікаў: «...у эканамічным плане я гатовы прызнаць іх [прадпрымальнікаў], каб яны пачалі ствараць, а не нажываць капітал спекуляцыяй...» (485), у мастацкай прасторы яго твораў паступова набывае пазітыўны сэнс. Прыгадаем: працаўніком-збіральнікам капіталу выступае ў аповесці «Без пакаяння» Анкуда, прадпрымальнікам з «чалавечым» тварам прадстаўлены ў «Крывінцы» Галаван. Аднак і ў тым, і ў другім выпадку абодва літаратурныя героі — забойцы. І гэтым самым пісьменнік ускосна забраў у іх права на чалавечае існаванне. Анкуда гіне, а Галаван, заказаўшы смерць невінаватаму ні ў чым быламу сябру і не змогшы з-за гэтага потым забіць сябе, прымаючы вонкавае пакаянне (у царкве «ставіць дарагую свечку за ўпакой раба Божага Васілія, запісвае яго аднаго ў памінальны лісток, заказваючы малебен. І ахвяруе буйныя сумы царкве»), на самай справе мае здзеклівыя адносіны да рэчаіснасці і ўмоў жыцця, якое для яго працягваецца як бясхмарны шлях наперад. Апошні сказ-выснова аповесці («Што яшчэ можа так пазабавіць, як старое вучэнне, абвергнутае практыкай!»), пададзены як выснова Галавана, праецыруецца на ранейшую думку пісьменніка (як няўласна простая мова яна ўключана ў кантэкст разважанняў Галаванавага сына, Віталія) адносна таго, што «чалавецтва ў сваім развіцці пайшло не па той дарозе». Такім чынам аўтар ускосна падводзіць да высновы, што і гэты новы багаты гаспадар ідзе не па той дарозе. Яна датуль працягваецца, пакуль паспяховая. Але ці доўгім будзе такі працяг і ці працяглай — такая паспяховасць? Гэта ўжо пытанні, ускосна адрасаваныя пісьменнікам чытачу...

Калі ўлічыць той факт, што маральная і грамадская пазіцыя Віталія ў пэўнай ступені блізкая пазіцыі аўтара «Крывінкі», то можна сцвярджаць, што ён, аўтар, усё ж не верыць у з'яўленне бізнесмена з «чалавечым» тварам. Віталій скептычна ставіцца да клопату прадпрымальнікаў «пра галодных, бедных, пра дзяцей і пенсіянераў», сумняваецца, што яны «дадуць ім чалавечае жыццё» і праз гэта «будуць героямі», як пра гэта марыць пісьменнік Іпаліт Пятровіч.

Галаван жа, гуляючы ў чалавечнасць, імкнецца стаць такім гаспадаром, якому пакланялася б эліта яго краіны: «Гаспадарамі мы станем тады, калі ў нашых руках будзе не толькі эканоміка, але і сродкі ўздзеяння на мазгі рабацяг. Я адчую сябе гаспадаром, калі да

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

мяне прыйдуць на паклон і Быкаў, і Савіцкі, і Шамякін, і Яроменка... Бачыў, як я расчуліў гэтага славутага жабрака (Іпаліта Пятровіча, паабяцаўшы даць яму грошы на пастаноўку яго п'есы.— *А. М.*)? Ажно заплакаў, нябога. Усе яны павінны плакаць... ад удзячнасці нам». У той жа час ён адчувае страх, безабароннасць у грамадстве, у якім выкрадаюць людзей, у якім знікла яго дачка. На фоне ўласнага гора галоўны герой прыходзіць да высновы, што ён ненавідзіць, «калі грошы ідуць на любое злачынства». Разам з гэтым Галаван аддае даляры на здзяйсненне злачынства: забойства меркаванага віноўніка знікнення Арыядны.

І тут справядлівай бачыцца выснова пісьменніка, якую ён уклаў у свядомасць Галавана яшчэ ў той час, калі той не прыйшоў да рашэння, што Навагодава, які, паводле яго і жончынага меркавання, з'яўляецца віноўнікам знікнення іх дачкі, неабходна пакараць смерцю: «Такое грамадства асуджана».

Асуджанасць гэтага грамадства сцвярджае і сам Галаван ва ўмовах, калі «жыццё страціла сэнс» для яго пасля другога знікнення дачкі, калі сам ён заказвае забойства Навагодава.

«Чалавечы» твар гэтаму свайму герою пісьменнік імкнуўся надаць і пры дапамозе адлюстравання веры Георгія Яўменавіча ў Бога. Але якой яна была, гэтая вера?

Ён, бязбожны, «які на Вялікдзень упершыню перахрысціўся», «вывучае Евангелле». Паводле павучанняў жонкі, імкнецца пазбягаць рабіць зло іншым. У той жа час такая пазіцыя — гэта не шчырае перакананне, а вынік страху перад перспектывай пакарання Стваральнікам. Пасля таго як Галаваны страцілі надзею на вяртанне дачкі, «рэлігійныя перакананні яго (Георгія Яўменавіча.— *А. М.*) набылі іншы сэнс, не паказны — як усе, так і я,— а сапраўды духоўны. Маліўся разам з жонкай, заходзіў у царкву. Праўда, часам пад чаркай...».

Што ж прыводзіць чалавека, які нібыта стаў на шлях веры ў Бога, да забойства?

Найперш любоў да дачкі: «любіў больш за ўсё на свеце», «любіў да забыцця». Любоў гэтая «таіла ў сабе нечаканыя сюрпрызы». І вось адным з такіх сюрпрызаў, самым страшным, стала жаданне помсціць, бо «жыццё і паліць, і рэжа», бо існаванне без дачкі стала невыносным.

«Што павяло Галавана (на сустрэчу з кілерам.— *А. М.*)? Пачвара помсты ці бязвінная цікаўнасць?» — задае пытанне пісьменнік, якое адрасавана адначасова і яго герою, і чытачу, і самому аўтару аповесці. «Цікаўнасць» — хто вывеў яго на кілера, і ці кілер гэта ўвогуле? — гэта толькі тактычны ход для ўзбуджанай прагай помсты

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

свядомасці галоўнага героя. На самай справе Галаван жадаў помсты, пакарання: «І ён павінен панесці пакаранне!» Разам з тым ён нясмела пратэставаў супраць пакарання смерцю Навагодава: «Галавану адлягло ад сэрца: могуць і не зрабіць (кілеры забойства Навагодава.— *А. М.*). Няхай бы не зрабілі! [...] Але што жонка пачувала сябе лепш і як бы выходзіла з жалобы, гаіла адкрытую рану,— ад гэтага Георгію Яўменавічу не рабілася лягчэй. Ён з пэўнай зайздрасцю да яе заспакаення думаў: «Каб ты ведала, што робіцца ў маёй душы! Якія там пакуты! Які грэх, інакш ты гэта не назавеш».

Але час ішоў, нічога не здаралася (з Навагодавым.— *А. М.*), і ён паступова пачаў "прыходзіць у норму"».

Арганізаваўшы забойства былога сябра, а пасля даведаўшыся, што той невінаваты, Галаван спачатку ў якасці водкупу за такі ўчынак мяркуе разлічыцца грашыма з яго сям'ёй. Потым прыйшло жаданне пакараць самога сябе «ў злашчасным басейне», але не хапіла дзеля гэтага духу: «...шпурнуў пісталет у дальні кут басейна».

У аповесці «Без пакаяння» галоўны герой, які забіў бязвіннага хлопчыка, сам (хай сабе і падсвядома) узводзіць сябе на шлях пакарання. На такі шлях ступіў і Галаван у аповесці «Крывінка». Але пісьменнік раптоўна перапыняе гэты шлях да самапакарання яго героя. Цынізм Галавана, ужо душэўна акрыялага пасля вяртання да яго блудніцы-дачкі, у фінальнай частцы «Замест эпілога» абсалютны. Яго ранейшае імкненне да духоўнага ўзвышэння праз веру, праз засваенне важных духоўных прынцыпаў ім жа самім і перакрэсліваецца: «...сын-філосаф... сваім сцвярджэннем, што такое грамадства не мае права на існаванне, маці проста палохаў: а калі адбяруць катэдж? А бацька хмыкаў з сынавай філасофіі: няхай пацешыцца, папрактыкуецца, адшліфуе чарговы артыкул. А для яго, уладара мільярдаў, забава. Што яшчэ можа так пазабавіць, як старое вучэнне, абвергнутае практыкай!»

«Старое вучэнне, абвергнутае практыкай» таго, хто жадае, каб яму пакланялася эліта грамадства, у гэтай аповесці пераможана.

Тым не менш у творы прысутнічае надзея, што гэтае «старое вучэнне», адаптаванае грамадскай свядомасцю да іншых ідэалаў — сацыялістычных,— усё ж можа быць захаваным.

Віталій, сын галоўнага героя аповесці — «трыццацігадовы кульгавы філосаф», дацэнт універсітэта, як і Насця ў «Выкармку»,— прыхільнік «ідэй сацыялізму». Ён «палітычны антыпод бацькі»; старэйшы Галаван так характарызуе сына: «бальшавік ты», «галодны марксіст». Маці «з горыччу ўспамінала, што сын жыве без Бога ў душы. І калі ён адмовіўся прыехаць на саракавіны (па сястры.— *А. М.*), са злосцю і болем упікнула: «Бязбожнік ты! Бальшавік!»



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сам жа Віталій і аўтар аповесці наступным чынам характарызуюць яго стаўленне да Бога і веры: «— Я нічога не кажу супраць Бога [...] Сам лічыў, што паглыбленае вывучэнне Бібліі і гісторыі хрысціянства ўзбагацілі яго, але да веры не далучылі, веды не даюць веры,— канстатаваў ён з жалем, бо лічыў: з верай, з любой верай менш было б сумненняў, а менш сумненняў — лягчэй жыць».

Віталій выяўляе прынцыповасць у адносінах да сваіх грамадскіх ідэалаў: «...яго Зойка (жонка.— *А. М.*) занадта свабоду любіць. Хацела ў бэнээф падацца. Ды тут ужо Віталік праявіў характар... бацькаў».

Праз няўласна простую мову, якая праецыруецца і на думкі Віталя, і на перакананні самога пісьменніка, і на свядомасць адпаведных чытачоў, аўтар імкнуўся праілюстраваць, што «ідэі сацыялізму» — гэта не вынаходніцтва новага часу, што яны былі яшчэ ў далёкай старажытнасці, толькі бяда ў тым, гаворыць Віталій на паніхідзе па Арыядне, «што за два тысячагоддзі хрысціянства не навучылася жыць па Свяшчэнным Пісанні. Ісус Хрыстос прапаведаў ідэі сацыялізму, а мы яшчэ жывём па воўчых законах: што схапіў, тое і маё. Я грызу і ні з кім не падзялюся...»

Такім чынам, як адну з каштоўных і выратавальных формаў грамадскай свядомасці пісьменнік вылучаў «ідэі сацыялізму». І. Шамякін іх паслядоўна адстойваў у аповесцях другой паловы 1990-х гадоў не толькі ў высновах старэйшага пакалення (напрыклад, у разважаннях «вернага камуніста» — пісьменніка «Івана гомельскага» з аповесці «Выкармак»), але і праз жыццёвую пазіцыю літаратурных герояў сярэдняга пакалення (напрыклад, Насці, таксама з аповесці «Выкармак»,— «шалёнай бальшавічкі», «камсамолам выхаванай»). Такія факты, відаць, нездарма ўведзены ў мастацкую прастору гэтых аповесцей. Яны ўскосна сведчаць пра наступную пазіцыю пісьменніка. «Ідэі сацыялізму» яшчэ могуць мець будучыню, бо яны паслядоўна адстойваюцца трывалай у маральных адносінах часткай грамадства, якая не здрадзіць ім, нягледзячы ні на якія матэрыяльныя выгады. Насця («Выкармак») і Віталій («Крывінка») застаюцца адзінокімі ў сваіх грамадскіх пераканannях. Але яны, хоць і адчуваецца пэўная штучнасць іх характараў, выклікаюць чытацкую сімпатыю: яны не як усе, яны, адданыя сваёй ідэі, не саромеюцца агучваць яе, не зважаючы на негатыўнае стаўленне большасці грамадства да такой іх пазіцыі.

Тым не менш даводзіцца канстатаваць, што такая пазіцыя некаторых герояў І. Шамякіна не знаходзіць прызнання, яны — такія героі — адзінокія ў сваіх імкненнях пераканаць большасць. І тут да месца прыгадаць выснову, якую пісьменнік аднёс да разважаняў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Віталія Галавана: «Чалавецтва ў сваім развіцці пайшло не па той дарозе».

Такая выснова — гэта і выразная аўтарская пазіцыя І. Шамякіна, якая татальна ўплывала на ўсю сістэму сэнсаўтварэння ў яго аповесцях другой паловы 1990-х гадоў. Адсюль у творах гэтага перыяду сацыяльны разлад, беспрасвецце, несправядлівасць. А малая доля надзеі і спадзяванняў прысутнічае ў іх на ўзроўні прадчування лепшага магчымага, якое перакрэсліваецца ўсё той жа безвыходнасцю.

*Алесь Макарэвіч*

Архив библиотеки МГУ имени